2. Министерству обороны, Министерству культуры, Министерству иностранных дел, Комитету государственной безопасности, Госкомархиву, Минскому горисполкому, Минскому облисполкому, Национальной академии наук Беларуси совместно с другими заинтересованными в месячный срок создать рабочую группу специалистов для оказания содействия и необходимой помощи по разработке научной концепции мемориального комплекса "Тростенец" с учетом исторических событий в годы войны и современной ситуации на данном объекте, фактора времени, нравственного, политического, социально-психологического и экономического аспектов данной проблемы.

Подготовленный проект концепции представить на утверждение в Совет Министров Республики Беларусь.

3. Последующие мероприятия по меомориализации комплекса "Тростенец" заинтересованным планировать в соответствии с утвержденной концепцией.

4. Разработчикам Республиканской программы по увековечению памяти защитников Отечества и жертв войн при разработке программ на последующие годы, учитывая финансовые возможности нашего государства, предусматривать поэтапное включение в Программу мероприятий по созданию мемориального комплекса "Тростенец".

5. Заказчиком выполнения всего объема работ по созданию мемориального комплекса "Тростенец" определить Мингорисполком.

6. Министерству культуры Республики Беларусь в процессе поэтапного создания мемориального комплекса "Тростенец" оказывать методическую помощь по его мемориализации, а также взять под контроль художественный уровень произведений монументального искусства, входящих в состав мемориального комплекса.

Министр культуры
Республики Беларусь
А.Сосновский
01-06/82 от 11.01.99 г.

Врио Министра обороны Республики Беларусь
генерал-лейтенант
М.Козлов
№1/19 от 11.01.99 г.

* * *

Есть надежда, что беспамятству, коснувшемуся тростенецкой трагедии, будет положен конец. И что будущий мемориальный комплекс станет местом паломничества тысяч и тысяч людей доброй воли — наших сограждан и гостей из-за рубежа, кому ненавистны фашизм и насилие, дороги идеалы добра и созидания.

Міжусобная барацьба так званых "лідэраў нацыі" толькі разбурае і руйнуе беларускую справу

Паважаная рэдакцыя!

У вашай газеце ад 16 сакавіка мы са здзіўленнем прачыталі "Заяву ўдзельнікаў Кангрэса дэмакратычных сіл", падпісаную спадарамі Шушкевічам, Астапенкам, Лугіным, Арцішэўскім, Ванінай, у якой старшыня Выканаўчага бюро Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацый разам з Карпенкам, Саннікавым, Быкавым і Статкевічам абвінавачваюцца ў стварэнні Кансультацыйна-каардынацыйнай рады (ККР) — вузка-абмежаванай структуры, якая нібыта не мае аніякага дачынення да рашэнняў Кангрэса дэмакратычных сіл і "патрэбна ўдзельнікам нарады, каб выдаваць сябе ў замежжы за лідэраў беларускай апазіцыі...".

У сувязі з тым мы хацелі б давесці да чытачоў вашай паважанай газеты наступнае:

1. Ні Выканаўчае бюро Асамблеі, ні яго старшыня не мелі аніякага дачынення да абмежавання прадстаўніцтва партый і іншых арганізацый у ККР. ВБ Асамблеі не з'яўлялася сябрам аргкамітэту Кангрэса, не рыхтавала праекты дакументаў, не брала ўдзел у распрацоўцы палажэнняў аб Кансультацыйна-каардынацыйнай радзе. ВБ і арганізацыі Асамблеі прымалі самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Кангрэса, забяспечылі прадстаўніцтва больш за 170 дэлегатаў ад няўрадавых арганізацый з усёй краіны і правялі абласныя канферэнцыі па вылучэнні дэлегатаў ад НА. Мы разглядалі і разглядаем Кангрэс ў якасці вельмі важнай палітычнай падзеі, скіраванай на кансалідацыю ўсіх дэмакратычных сіл. Мы далучыліся да ККР, каб мець магчымасць і далей працаваць на гэтую кансалідацыю.

2. Уладзімір Роўда не з'яўляецца прадстаўніком Асамблеі ў ККР. На пасяджэнні Рабочай групы ад 23 лютага такімі прадстаўнікамі былі абраныя Вінцук Вячорка (Цэнтр Супольнасць), Міхаіл Пастухоў (БАЖ) і Валеры Костка (БХК).

3. Асамблея дэмакратычных няўрадавых арганізацый аб'ядноўвае зараз больш за 550 НА Беларусі і з'яўляецца, такім чынам, самай прадстаўнічай структурай дэмакратычнага "трэцяга сектару". Арганізацыі Асамблеі дэкларуюць такія прынцыпы, як незалежнасць нашай краіны, дэмакратыя, правы чалавека і інтэграцыя Беларусі з Еўрапейскай супольнасцю. Гэтыя прынцыпы мы адстойваем непалітычнымі метадамі, імкнёмся пашырыць уплыў дэмакратычных сіл у нашым грамадстве. Кожная арганізацыя, што ўваходзіць у Асамблею, мае роўныя правы з усімі іншымі ў незалежнасці ад колькасці сяброў, вопыту ці ўзросту арганізацый. Кожная з іх мае рэальныя магчымасці данесці сваю думку да іншых, прыняць удзел у рашэнні тых пытанняў, у якіх яны зацікаўленыя на нацыянальным, рэгіянальным ці мясцовым узроўні праз дэмакратычныя механізмы.

Мы не прэтэндуем на нейкае лідэрства ў дэмакратычнай апазіцыі, таму што ўпэўнены, што яно не залежыць ні ад мінулых заслуг, ні ад галосных дэкларацый, ні ад мітуслівых акцый. Міжусобная барацьба так званых "лідэраў нацыі" толькі разбурае і руйнуе беларускую справу, вядзе да страты даверу грамадзян да апазіцыі, дапамагае дыктатарскаму рэжыму і далей захоўваць сваё панаванне. Мы імкнёмся да салідарнасці ў дзеянні і лічым, што гэта адзіны шлях, які вядзе да сапраўднага аб'яднання дэмакратычных сіл краіны.

Выканаўчае бюро Асамблеі
дэмакратычных няўрадавых
арганізацый.

Крымінал

Прагнасць прыводзіць на нары нават вартавых парадку

Супрацоўнікі аддзела ўласнай бяспекі УУС Магілёўскага аблвыканкама ўзялі на месцы злачынства оперупаўнаважанага Ленінскага РАУС горада Магілёва прапаршчыка міліцыі Уладзіміра Баяркіна. Ён затрыманы пры атрыманні хабару ў памеры 1515 долараў ЗША. Пракуратурай вобласці ўзбуджана крымінальная справа. Як паведамілі карэспандэнту БелТА ў прэс-цэнтры УУС, Уладзімір Баяркін арыштаваны і змешчаны ў следчы ізалятар.

Мікалай НАЗАРОВІЧ.

І такое бывае

У апошні шлях — па вадзе...

Водная стыхія на Палессі парушыла не толькі звычайны гаспадарчы ўклад жыцця людзей, але і ў арганізацыю рытуальных спраў. Сямідзесяцігадовую жыхарку вёскі Хлупін Алену Піліпаўну Точка, якая памерла, прыйшлося праводзіць у апошні шлях на катэрах і лодках. У гэтым населеным пункце вада паднялася настолькі, што перамяшчэнне ад дома да дома, да магазіна і іншых жыццёва важных аб'ектаў магчыма толькі на плыўсродках. Як расказаў карэспандэнту старшыня Перароўскага сельскага савета Жыткавіцкага раёна Адам Швед, пахаванне адбылося на новых могілках, паколькі старыя знаходзяцца пад вадой. А 25 сакавіка бяда пастукалася ў адзін з дамоў вёскі Пятроўскі Млынок: тут памёр саракагадовы мужчына. Апошні шлях яго пралёг таксама па вадзе.

Віктар КОТАЎ.

Трагедыя

Загінуў лідэр апазіцыі на Украіне



У аўтакатастрофе загінуў народны дэпутат Украіны, лідэр Народнага Руху Вячаслаў Чарнавіл. Як паведаміла кіеўскае агенцтва ДІНАУ, трагедыя здарылася 25 сакавіка каля 23.30 на аўтатрасе недалёка ад вёскі Гарадзішча Барыспальскага раёна на Кіеўшчыне. Аўтамабіль "Таёта", у якім быў Вячаслаў Чарнавіл, сутыкнуўся з аўтамабілем КамАЗ. Разам з В. Чарнавілам загінуў яго памочнік-кансультант Я.Паўлаў, які быў за рулём. Яшчэ адзін пасажыр, прэс-сакратар Руху Дзмітрый Панамарчук, траўміраваны і дастаўлены ў бальніцу.

БелТА.

Суд над Абдуллахом Оджаланом откладывается

Власти Турции объявили, что суд над лидером Абдуллахом Оджаланом откладывается до тех пор, пока не будет готово специальное помещение для судебных заседаний. Суд будет проходить в тюрьме на острове Имралы, где содержится Оджалан. Судя по всему, процесс начнется не раньше 30 апреля.

Европейский Союз шлет продовольствие России

В Россию прибыла первая партия продовольственной помощи от Европейского Союза. 24 грузовика доставили на днях в Смоленск говядину из Германии — по 18 тонн каждый. В общей сложности в Россию прибудут 600 таких грузовиков. Представитель Еврокомиссии в России Жильбер Дюбуа заявил, что обострение ситуации на Балканах не отразится на графике поставок помощи от ЕС на общую сумму 500 миллионов долларов.

Вітаем!

Часам кветкі распускаюцца прама на сцэне

Белая кветка, што распускаецца на нябёсах, — так перакладаецца назва японскага тэатра "Мандзюсака". У пачатку красавіка яна будзе "цвісці" ў нашых краях. Свае амаль трохтыднёвыя гастролі гэты калектыў вырашыў прысвяціць дзецям, якія жывуць у чарнобыльскай зоне.

Змогуць пазнаёміцца з незвычайным мастацтвам тэатральнай трупы з Краіны ўзыходзячага сонца і жыхары Мінска. Як паведаміла карэспандэнту БелТА загадчыца літаратурна-драматычнага аддзела Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Жанна Лашкевіч, японскія акцёры сыграюць на яго сцэне 3 і 4 красавіка. Сталічная публіка зможа па заслугах ацаніць ўвасобленае на сцэне спляценне традыцыйнага японскага тэатра з сучасным еўрапейскім. У цэлым за 18 дзён тэатр плануе даць 15 спектакляў, у тым ліку ў Краснаполлі, Буда-Кашалёве, Гомелі, Брагіне, Чачэрскім раёне. Сваю гастрольную паездку гэты калектыў арганізуе сумесна з дабрачыннай японскай арганізацыяй "Мост у Чарнобыль".

Аксана ПІВАВАР.

Во даюць!

Нецвярозы за рулём — два гады турмы?

У Сейме Польшчы знаходзіцца законапраект аб змяненні пакарання за кіраванне машынай у нецвярозым стане. Ён прадугледжвае адняселле гэтага правапарушэння да разраду крымінальных злачынстваў, за якія будзе выносіцца пакаранне да двух гадоў турмы і канфіскацыя аўтамабіля.

Цікава, што крымінальна будзе карацца таксама кіраванне веласіпедам ў нецвярозым стане. За гэта будзе выносіцца пакаранне да года турмы.

Юрась ЗЯНКОВІЧ, БелТА.

Творчасць чытачоў

Боль за Айчыну

Шкада, што у пашане маем хамства,
І горка, што з вярхоў яно ідзе.
Няўжо і праўда — крочым мы у рабства?
І хто ў бядзе нас гэтую вядзе?

Балюча мне — чыноўнік мову топча,
Глумліцца ён з яе, нібыта кат.
І хтосьці з нас у бок адводзіць вочы,
А нехта навет бачыць гэта рад.

Радзіму нашу ганьбяць — ці ж не крыўдна,
Ды граззю не любяць абліваць.
Няўжо, браток, і сапраўды мы — быдла?
І можа нас куды захочаць гнаць?

Агідна мне — эфірам правіць хеўра
І абражае нас хлуснёй штодня.
Няўжо так і не выберамся з цемры?
Ці будзем і далей — бы нямеля?

Сумленне, гонар, годнасць чалавека —
Усё адмецена, бы тое смецце, бруд.
Чаго чакаць нам на сканчэнні веку?
Я свята веру — будзе Божы Суд!

Леанід КРАЎЧОНАК.

г.Мядзель.

Жыццё як яно ёсць

Удовіна доля

Піліпаўна — хваравітая, шчуплая, хаця і не старая яшчэ жанчына. З маладых год удава. Жыве ў мястэчку адна, дачка ў горадзе. Каб і хацела, тая мала чым можа дапамагчы. Наадварот, маці даводзіцца дапамагаць дачцэ, а самой звыкла спадзявацца толькі на сябе. Жыве на пенсію, сёе-тое мае з лапіка зямлі пры старой хаціне. Вось абразкі з удовінага жыцця.

Бутэлька

Вясною Піліпаўна прыбралася. Навяла глянец на падворку, у агародзе. Смецця набралася цэлая горба, усё такое, што ў хату не павалачэш: згарыць не згарыць, а толькі печ засмеціш.

Як мяла ды грэбла, дык не задумвалася, куды смецце падзець, на іхняй вуліцы шмат у каго свае "лапатунчыкі". Угаворыць каторага — завязе на звалку. А выйшла, што не ўгаварыла. То часу ў суседзяў няма, то бензіну, то трактарчык няспраўны.

А горба ляжыць, вочы мазоліць. Думала Піліпаўна, думала і — прыдумала. Схадзіла ў магазін, купіла пляшку гарэлкі, прынесла і на горбу паставіла. Стаіць бутэлька, на сонцы металічнай галоўкай паблісквае. А Піліпаўна на лаўцы пры хатцы села, цікуе: не можа быць, каб нікога бутэлька не прывабіла.

— Ты глядзі, — пачула неўзабаве, — бутэлька! Паўнюткая!

Два мужыкі прыпыніліся, але не дапетрылі, пэўна, што да чаго і далей пайшлі. Потым хлопцы, падшпаркі, бутэльку убачылі.

— А, гэта баба хоча, каб ёй хто смецце вывез, — здагадаліся яны.

Ідуць па вуліцы прахожыя. Адны ўсміхаюцца, убачыўшы бутэльку, другія дзівяцца, трэція вачыма шныраць, ці блізка хто ёсць.

Піліпаўна чакае, сядзіць ціхенька, свежым паветрам дыхае. Нават крыху прыдрамала была.

— А туды-т тваю... дурная баба, — пачула голас суседа, які з вёдрамі ішоў да студні. — Казаў жа — вывезу, дык не, нецярпячка ўзяла!

Да вечара на падворку ў Піліпаўны не было ўжо ні горбы, ні бутэлькі. Гаспадыня любавалася парадкам і хваліла сябе за кемлівасць.

Дошкі

Хата ў Піліпаўны як ўсё роўна ў балоце. Месца нізкае, бульбу ў склепе часам падтапляе. І тады кабета выбіваецца з сіл, дастае мокрую бульбу, прасушвае.

— Ты б насціл ў склепе зрабіла, на яго і паклала бульбу, — раілі суседкі. — Тады вада не дастане.

Добра ім гаварыць, думала Піліпаўна. У кожнай мужык. Ды дошак поўны двор. А ёй з чаго той насціл рабіць?

Аднак жа неяк надумалася: зраблю той чортавы насціл! Перабрала на сядзібе ўсё, некалькі дошак знайшла. Па астатнія да суседзяў схаджу, вырашыла. А то — ўкраду, бо могуць жа і не даць.

Пайшла сярод белага дня. Яшчэ раней нагледзела некалькі дошак на падворку ў Валіка Беразоўскага. Абыдзецца ён без іх, падумала, можа, і не заўважыць згубы. Прынесла ў свой двор, паклала на віду, не хавала — няхай бачаць усе, хто хоча. І пайшла за некалькі хат далей, да Жэніка Парожняга. У таго дошак — поўны двор, і ўсе складзены проста ля плоту.

Піліпаўна не спяшалася. Выцягнула адну дошку, другую; падцягнула да весніц. Вярнулася за трэцяй. Гэта даўжэйшая, з сярэдзіны не паддаецца, трэба за канец цягнуць. Абышла штабель, нагнулася — і ад нечаканасці ўскрыкнула. Руды жэнікаў сабака вынырнуў аднекуль з-пад дошак і без усялякага брэху схапіў яе ззаду за паліто. Кавалак тканіны ці не на цэлую далонь застаўся ў сабачых зубах.

Руды, мабыць, і сам напалохаўся, якой бяды нарабіў, бо гэтак жа хутка, як і выскачыў, схаваўся ў будцы пад дошкамі.

Піліпаўна так разгубілася, што не ведала, што і рабіць. Вельмі зашкадавала паліто. Няхай сабе і старое, але лёгкае, цёплае, у чым цяпер хадзіць?

Хацела была плюнуць на тыя дошкі, пайсці дадому. Ды апамятавалася. Не, без дошак яна цяпер не пойдзе! Узяла такі тыя першыя, што здагадалася падцягнуць да весніц.

Увечары Піліпаўна ўшчувала Жэнікаву жонку: "Не сабака, а нейкая халера ў вас, цэлы зад у паліто вырваў. Можа, у буду занёс, пашукай ты мне, Лёдзечка".

Назаўтра цэлы дзень Піліпаўна лапіла паліто. Украдзеныя дошкі мо з тыдзень ляжалі ля ганка. Неяк зазірнуў да яе за чымсьці Жэнік.

— Дык гэта ж мае дошкі, цётка!

— А чые ж? Вядома, твае, — згадзілася Піліпаўна. — Я і заплаціла за іх. Думаеш, за так мне твой сабака зад з паліто выдраў? Не, даражэнькі, не за так, а за дошкі...

Жэнік спачатку няўцямна глядзеў на кабету, а потым усё зразумеў і зайшоўся смехам...

Прысела...

Хата ў Піліпаўны — не тое што катэдж ці гарадская кватэра. Выгод ніякіх. Пра цёплы туалет і гаварыць няма чаго.

Падворак нішто сабе, абсаджаны яблынямі, кустамі чорных парэчак. Утульна тут, зацішак, летам прахалода. Адно бяда — зрабілі з яго прахадны двор. З суседняй вуліцы сігаюць проста ў агарод праз асеўшы плот дзецюкі, бягуць падворкам: гэта найкарацейшы шлях да "кропкі" з гарэлкай, што непадалёк ад хаты Піліпаўны.

Гэтая "кропка", а дакладней, найкарацейшы шлях да яе ледзь не каштавалі Піліпаўне жыцця. У прыцемках выйшла з хаты, прысела за кустоўем па малой патрэбе, якраз на злашчаснай сцежцы. Зрэшты, яшчэ і прысесці як след не паспела, — пачула грукат вялізных кірзачоў, чыесьці калені стукнулі ёй па патыліцы, і доўгія ногі, перакуліўшыся праз яе, расцягнуліся ўздоўж сцежкі. Піліпаўна не паспела і войкнуць, як па спіне грукнулі яшчэ адны боты, і хтосьці побач пляснуўся проста аб сцяну куратніка.

— Маць тваю... — заенчыў нехта, устаючы.

— Ціха ты, матай лепш адсюль, — сігануў праз весніцы другі, — бабу мо прыдушылі!

Назаўтра бедная Піліпаўна паказвала сінякі сваёй суседцы: "Памаж, Манечка, ёдам, можа, не так балець будуць. Наляцелі гэтыя коні, добра яшчэ, што косці цэлыя ды куратнік не разваліўся".

— Ой, не кажы, — спачувала Маня. — Шастаюць па начах, усё выпіўку шукаюць...

Палікарп АБРАМОВІЧ.

в.Бераставіца Гродзенскай вобласці.

Слышали?

Марина Влади вернулась в "Вишневый сад" и продала родовое имение

На сцене парижского театра "Эспас Карден", принадлежащего знаменитому кутюрье, идет "Вишневый сад" в постановке одного из старейших французских режиссеров Жоржа Вильсона.

Роль Любови Андреевны играет Марина Влади. Предлагаем нашим читателям фрагмент интервью московского новоизвестинского журналиста Юрия Коваленко с известной актрисой, бывшей женой знаменитого Владимира Высоцкого.

— Созвучен ли ваш "Вишневый сад" тому, что происходит сейчас в России?

— Разумеется, у нас на дворе снова конец века... Я недавно была в Москве и пришла в ужас, увидев, что творится на улицах. Люди стоят с протянутой рукой.

— С какой целью вы приезжали в Москву?

— На 60-летие Высоцкого — и на мое собственное. Нам обещали концертное турне, но, к сожалению, нас обманул человек, некто Курцер, русский, который живет в Америке. Он готовил это турне по России, Америке и Израилю. С нами должны были выступать Сева Абдулов, Марк Розовский. Мы репетировали, я выучила все тексты — стихи Высоцкого, должна была петь его песни, но за 10 дней до премьеры все сорвалось.

— Вы теперь полностью перешли на театральные подмостки?

— Я начинала в театре и всегда была театральной актрисой. Правда, потом у меня был большой перерыв, когда я вышла замуж за Высоцкого и не могла проводить целый театральный сезон в Париже.

— Где вам интереснее — в кино или на сцене?

— Конечно, в театре, где живой спектакль, который вы разыгрываете перед зрителями. Именно в театре есть замечательные роли, а в кино для женщин моего возраста их практически нет. Правда, иногда мне предлагают маленькие роли и я снимаюсь. А мой театральный репертуар в последние годы — это и Любовь Андреевна, и Гертруда в "Гамлете", и Марина Цветаева в пьесе "Переход" француженки Вероники Ольми.

— Вы встречаетесь с русскими режиссерами и актерами?

— Сейчас нет. В России я почти не бываю, разве что иногда вижусь с ними в Париже. Но я не веду светскую жизнь, сижу дома, много работаю.

— Не кажется ли вам, что Высоцкого в России начинают понемногу забывать?

— Нет, это не так. Зачем вы так говорите? Новое поколение его читает и слушает. Он незабываем.

— Какова ваша иерархия человеческих ценностей?

— Самое главное — ум, культура, свобода сердца и духа — качества, которыми обладала настоящая русская интеллигенция. Кстати, Россия, где было так мало свободы и так много цензоров, имела удивительную культуру, какой не было ни в одной другой стране... Сегодня же главная забота — найти кусок хлеба, а не читать стихи или слушать музыку. Больше всего в современной России меня удивляет то, что деньги стали для людей главной целью.

— Вы с завидным постоянством продолжаете бороться во Франции за права иммигрантов — нелегалов, бомжей...

— Я не могу жить, видя спящих на улице людей. Я не могу лечь в свою теплую постель, зная, что на улице женщины с детьми ютятся в картонках. И я никогда не перестану бороться за бедных, за слабых, за тех, кто лишен возможности защищать свои права. Мне иногда при этом достается от полицейских, но это ничего.

— Обращаются ли к вам за помощью эмигранты из России?

— Я не миллиардер и всем помогать не могу. Я спасла одного режиссера. Он жил у меня три месяца, а потом я купила ему билет в Россию, и теперь он работает в московском театре.

— Раньше вы помогали и движению солдатских матерей в России...

— Это организация "Матери для мира", в которую я вошла уже давно. Я всю жизнь боролась за справедливость — еще со времен алжирской войны.

— Как поживают ваши сыновья — Петя и Игорь от брака с Робером Оссейном и Владимир от брака с летчиком Жан-Клодом Бруйе?

— Они, к сожалению, живут далеко. Петя — в Пиренеях на юге Франции, он гитарист, играет классику. Игорь обосновался на Таити и занимается в основном самим собой. После автомобильной катастрофы он два года был очень болен. А Владимир поселился в Парагвае, где разводит коров и лошадей.

— Ваши дети знают русский язык?

— В каком-то смысле для них это родной язык. Они даже ездили в пионерлагеря в Советском Союзе и, можно сказать, были советскими пионерами. В течение 12 лет, когда была замужем за Высоцким, я жила в России по 8 месяцев в году и отпуск проводила с Володей и детьми.

— Вы недавно продали ваш дом в парижском пригороде Мезон-Лаффит, который купили, когда вам было 15 лет. Это было родовое гнездо клана Поляковых. Разве это не то же, что для Любови Андреевны продать ее вишневый сад?

— Нет, это совсем другое. В отличие от Любови Андреевны я не была вынуждена продавать. Она продала, потому что у нее долги, а я — потому, что не хотела там больше жить. Я перебралась в Париж, ибо мне так легче работать в театре. К тому же наш дом был громадный, а иметь его для нас двоих с мужем нет никакого смысла. Я его покупала для нашей семьи. Но матери и сестер уже нет, а дети там жить не хотят.

Нявыдуманыя гісторыі

У жыцці творчых людзей здараюцца розныя забаўныя эпізоды. Магчыма, нават часцей, чым у людзей іншых прафесій. Вось толькі некаторыя.

Антонавы жарты

Я сустрэў іх на мінскім чыгуначным вакзале — Антона, начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі, і Пятра, яго памочніка. Антон быў у Мінску па справах, з'ездзіў да Пятра, які адпачываў у Ждановічах, і падаліся ў сталіцу "развеяцца".

— Пайшлі з намі, — прапанаваў Антон.

У рэстаране "Радуга" паабедалі, пагутарылі, парасказвалі анекдотаў. Выйшлі вясёленькія.

— Заглянем у аптэку? — спытаў Антон, здаровы мужык з густым басам, як у Левітана.

— А чаго? — піскліва, як Віцын, удакладніў Пятро, шчуплені, як хлапчук, вагой кілаграмаў сорак пяць.

Антон, не адказаўшы, падаўся ў аптэку. Мы за ім. У памяшканні нікога не было. Антон глянуў на лекі пад шклом і да прадаўшчыцы:

— Узбуджальнік у вас ёсць?

— Які? — спытала тая.

— Для яго, — паказаў на Пятра. — Конскі.

Прадаўшчыца ад смеху прысела за прылаўкам. Антонаў бас рагатаў на ўсю аптэку.

Пятру трэба было на электрычку. На вакзале Антон нахіліўся да Пятра і на вуха яму:

— Пеця, ты хацеў жанчыну. Паглядзі, які зад у прадаўшчыцы марожанага. Гэта мая знаёмая. Як нахіліцца, ты яе цапні.

Падкраўся Пеця і, калі тая нагнулася па марожанае, цапнуў яе. Здаровая жанчына кінулася на Пецю з кулакамі. Антон рагатаў на ўвесь вакзал, выціраў смяхотныя слёзы. Пеця, уцёкшы ад прадаўшчыцы, піскліва паскардзіўся:

— Заўсёды ты, Антон, падводзіш мяне.

Вось такія жарты, такая культура была (і ёсць) не толькі ў Антона і Пеці.

Падазроны гузік

Не помню, з якой нагоды сабралася кампанія: чатыры журналісты і брат аднаго з іх — Васіль, супрацоўнік рэспубліканскага Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Зайшлі да Рыгора, які жыў у "доме каля танка", дом той прэстыжны, спускаецца "лесвіцай" да Свіслачы. Пілі папулярнае тады віно "Агдам". Пагаманілі, пажартавалі, адным словам — павесяліліся.

Сабраліся разыходзіцца. Я апрануў плашч, а пакуль збіраліся астатнія, адышоў у кухню, стаў спіною да акна. Да мяне падышоў Васіль. Стаім, размаўляем. Раптам ён схапіў гузік на маім плашчы і спрытна адарваў яго. Я разгубіўся: што за ліха, адурэў чалавек з п'яні? А ён:

— Я думаў, што ў гузіку схаваны радыёперадатчык.

Толькі тут да мяне дайшло: у маім плашчы гузікі былі даволі вялікія і выпуклыя. Вось кэгэбэшнік Васіль і западозрыў адзін з іх. А мой калега, калі ўбачыў, што адбылося, напусціўся на брата.

— Ты што, зусім?.. Усе вы там памяшаліся, усюды бачыце толькі ворагаў, усё на свеце падазраеце. Сорам! Я ж табе колькі гаварыў, каб узяў сябе ў рукі. А ты? Ты нават нас падазраеш, табе звычайны гузік здаецца чорт ведае чым. Апамятайся.

Праз дзень-другі Васіль сарамліва папрасіў у мяне прабачэння.

Мікалай ДЗЕЛЯНКОЎСКІ.

Уточнение

В подборке зарубежной информации под рубрикой "Слышали?", опубликованной 26 марта т.г., в одной из заметок допущена неточность. Заголовок следует читать: "Чехия, Венгрия, Болгария поддержали решение НАТО". Кстати, в тексте информации говорится именно о Чехии.

Приносим извинения читателям газеты.

Нобелевская премия в области физики для немца и двух американцев

Стокгольм/Франкфурт-на-Майне (ИНП).

Впервые за последние девять лет Нобелевская премия в области физики вновь была присуждена немцу. Родившийся в 1949 году во Франкфурте-на-Майне Хорст Л.Штермер, а также граждане США Роберт Б.Лаулин (47 лет) и Дэниел С.Тсуи (50 лет) сделали открытие, которое позволяет лучше понять структуру материи. Эти три нобелевских лауреата установили, что электроны при низких температурах конденсируются в сильном магнитном поле. Они образуют своего рода жидкость, подобную тем, которые возникают в сверхпроводниках и жидком гелии.

Хорст Л.Штермер уже больше 20 лет живет и работает в США. Его жена — француженка. Ученый, работающий в знаменитом университете "Коламбия" в Нью-Йорке, пока не собирается возвращаться в Германию, так как он хотел бы продолжить свои научные изыскания в Америке. Применить на практике открытие ученых в ближайшем будущем не представляется возможным.

До этого Нобелевская премия в области физики присуждалась в 1989 году немцу Вольфгангу Паулю, а в 1995 году физик Клаус фон Клицинг получил стокгольмовскую премию за открытие в области квантовой физики.

ИН-Пресс.

Стоматологический центр "ВЕСОЛЬ": качество и забота о клиенте — в первую очередь. Наши цены невысоки даже сегодня

Дамы и господа! Все уже давно знают, что лечить зубы (если вас волнует их состояние и внешний вид) можно только в хороших частных стоматологических центрах. Вопрос только в том, чтобы остановить свой выбор на таком, где высокий уровень лечения сочетается с разумными ценами. Где вы платите за великолепное оборудование, отличные материалы и профессионализм врачей, а не за надуманный престиж. Поэтому разрешите порекомендовать вам МЦ "Весоль".

Лечение в центре "Весоль" (а это все виды современных стоматологических услуг: лечение зубов, исправление прикуса у детей и взрослых, лечение заболеваний десен, протезирование, в том числе сложное) осуществляется на новейшем американском оборудовании и только проверенными зарубежными материалами. Примером может служить тот факт, что в этой клинике (единственной в Минске!) есть новейшая система для пломбирования каналов из Германии — Thermafil, которая на 100% гарантирует, что зуб после лечения никогда больше не будет болеть.

Важнейшим направлением деятельности центра "Весоль" является профилактика. Даже при самом высоком качестве работы врачи обязательно проводят бесплатный профилактический осмотр своих клиентов раз в полгода, что позволяет вовремя обнаружить и предупредить появление новых "дырочек" и навсегда забыть о зубной боли.

Нет смысла говорить об анестезии. В центре "Весоль" вы никогда не услышите криков боли, так как эффективные анестетики полностью исключают появление каких-либо болевых ощущений.

Молодым мамам следует знать, что формирование зубов (и, как следствие, прикуса и улыбки) происходит в детстве. Поэтому необходимо, чтобы с малых лет ребенок находился под присмотром опытного стоматолога. Если вы доверите заботу о здоровье своих детей дантистам из "Весоль", можете быть спокойны — ваш ребенок вырастет со здоровой полноценной улыбкой, при этом не содрогаясь от мысли об испытанных муках.

Стоматологический центр "Весоль" предлагает также руководителям фирм, банков и других организаций, заботящимся о здоровье своих подчиненных, комплексное обслуживание по договорам. Быстрота и качество гарантируются.

Так что, уважаемые дамы и господа, выбор за вами, а стоматологический центр "Весоль" искренне желает всем здоровья и белоснежных улыбок и приглашает по адресу:

г.Минск, переулок Обувной, 7 (ст.м. "Фрунзенская").

Время работы: 9.00—21.00.

Телефон (017) 220-10-69.

Лицензия №572 выдана Минздравом РБ от 25.03.98 г. до 25.03.2003 г.

Александр КУСАКИН.
РИА "АПАШ".

"BRITA" — пользуйтесь чистой водой, или Наша вода больна и требует оздоровления

Помните, у Ромена Роллана в "Жан Кристофе": "Ребенок проснулся и начинает плакать. Мутный взгляд его блуждает. Как страшно! Тьма. И внезапно во тьме — яркий, резкий свет лампы; странные, смутные образы осаждают едва отделившееся от хаоса сознание; еще объемлет его со всех сторон душная колышущаяся ночь; и вдруг в бездонном мраке, как слепящий сноп света, возникают не испытанные дотоле острые ощущения; боль вонзается в тело, плывут какие-то призраки, огромные лица склоняются над ним — нельзя понять, что это такое..."

— Что же за этим последует?

— Будут кормить.

— Будут кормить, полагаете вы?

— Полагаю...

Чем? Неделикатный вопрос. А если у матери нет молока? Сегодня это не проблема. Детских смесей достаточно, и все — превосходны. На чем готовят смесь? На воде.

А какая у нас вода?

К сожалению, даже обычная водопроводная вода далека от идеала и содержит много примесей, таких, например, как хлор, железо, свинец, алюминий, медь, пестициды, известь и другие, которые не только ухудшают ее вкус и придают неприятный запах, но и могут пагубно влиять на здоровье человека. Взрослого человека. Что уж тут говорить о ребенке! Долгие годы лучшие врачи из разных стран подбирают идеальный для здоровья ребенка состав детских смесей, каш и т.д. Найденные ими варианты — уникальны. Сегодня, наконец, эти составы доступны и в нашей стране. Но знали бы эти самые ученые, на какой воде их будут готовить! И где — в государстве с не лучшим, мягко говоря, радиационным фоном. Поговорка "Береги честь с молоду, а платье — снову" сегодня могла бы звучать не только про честь, но и про здоровье, закладываемое с самых ранних — нет, не лет, а дней!

Что же государственные очистительные системы? А откуда черпают воду, поступающую в наши краны? А куда, в какие водоемы идут промышленные отходы? А вы ни разу не видели трубы, по которым поступает вода? И если даже вам недоступны данные химических исследований, то разве накипь у вас в кастрюле не отвечает на вопрос о государственных фильтрах?

Что делать?

Приобрести домашний фильтр фирмы "BRITA" (Германия), которая вот уже 25 лет работает в этой области и является лидером в производстве водоочистительных систем. Сейчас ими пользуются почти 70 млн. человек в 67 странах мира. Фильтры "BRITA" не требуют подключения ни к водопроводу, ни к электросети. Простота, которой достигли конструкторы фирмы, делает их доступными как школьнику, так и пожилому человеку. Сегодня существует целый ряд модификаций фильтров, которые по дизайну, цвету и размерам способны удовлетворить самые высокие запросы потребителя.

Несколько минут потребуется для того, чтобы обычная вода, "чихающая" из наших кранов значительной частью химических элементов таблицы Менделеева, прошла через единый фильтрующий элемент — фирменный картридж "BRITA", содержащий уникальный ионообменник и активированный уголь, обработанный серебром по специальной технологии (для семьи из 3—4 человек такого картриджа хватает на 1—1,5 месяца). И вот идеально подходящая для приготовления напитков и пищи вода готова. Эта вода оздоровлена.

Что могло бы вас убедить в эффективности фильтров "BRITA"? Исследования, проводившиеся в химических и биологических лабораториях института Фресениус, российского института им.Сысина, а также белорусского НИИ сангигиены:

степень очистки воды: хлор — 85%; свинец — 90%; медь — 95%; алюминий — 67%; линдан (пестицид) — 70%; стронций — 95%; цезий — 90%; железо — 99%; жесткость воды — 75%.

Кстати, кроме всего вышеперечисленного, картридж задерживает еще и радионуклиды!

Все, что хорошая хозяйка и мать готовит на воде, должно готовиться на хорошей воде! От этого выиграет не только здоровье, но и вкус. Избавьтесь от накипи в вашей посуде, от следов маслянистой пленки на поверхности чая, от еще одной проблемы, связанной со здоровой пищей для вас и ваших детей и внуков, вместе с фирмой "BRITA"!

Кстати, знаете финал процитированного в начале статьи отрывка из Ромена Роллана?

"Ребенок, казалось, несколько секунд колебался, заплакать ему или продолжать свою трапезу. Но так как нельзя было делать то и другое сразу, он в конце концов снова принялся за еду".

Ознакомиться с продукцией фирмы "BRITA" и приобрести фильтр можно в магазинах города.

Вадим ТЕЛЕШ.
РИА "АПАШ".

Навіны з правінцыі

І стаяць яны моўчкі пад дажджом і ветрам...

Кожны дзень з васьмі раніцы, у дождж і слоту ля ўваходу ў фірменны магазінчык макароннай фабрыкі збіраецца доўгая чарга. Большасць тут — пенсіянеры.

У дзевяць гадзін магазінчык адчыняецца, туды з-за цеснаты пускаюць не болей пяці-шасці чалавек. Тут можна купіць макароны-вітушкі па 37 тысяч рублёў за кілаграм (у дзяржаўных крамах такія ж каштуюць 81 тысячу, а гэта для большасці — лішняя дзірка ў кашальку). Страшэнна ўзляцелі цэны і на ўсе прадукты, дык хоць на макаронах можна сэканоміць некалькі тысяч.

Пачцівага ўзросту пенсіянерка ў пацёртым плюшавым жакеце тлумачыла прычыну свайго стаяння ў гэтай нуднай чарзе: "Каб давалі хоць пяць мільёнаў пенсіі, дык ці я мерзла б тут? З маімі ж двумя мільёнамі не параскашуеш".

Усе прамаўчалі, пэўна, думаючы пра сваё.

У магазіне "Стол заказаў" па вуліцы Чэхава, дзе прадукты адпускаюць інвалідам і ветэранам вайны па спецыяльных пранумараваных прапусках, у чаргу за ліверкай, крывянкай ці варанай каўбасой (зразумела, калі іх часам "падкінуць") набіраецца чалавек пяцьдзесят — болей гандлёвая зала не ўмяшчае. Для нямоглых інвалідаў уздоўж сцен стаіць з дзесятак крэслаў. І тут маўчаць пакупнікі-ільготнікі; калі вядуць гамонку, то пра надвор'е, свае старэчыя хваробы, успамінаюць гады маладыя. Калі б хто і загаварыў пра тых, што завялі краіну ў багну, яго тут жа асеклі б раўнівыя абаронцы "бацькі". Прывыклі беларусы ўсё жыццё кланяцца начальству, не пярэчыць яму адкрыта, хіба што на кухні дома пабурчэць. Прывыклі давяраць таму, што дзяўбуць у галаву зверху. Дзесяцігоддзямі верылі байкам пра "загніваючы капіталізм", цяпер — пра "рынкавы сацыялізм", таму і ліверка пасля дзьвюх-трох гадзін чакання ў чарзе — ласунак!

Што, так і будзем радавацца, бы галодны сабака-бадзяга, гэтаму кавалку каўбаснага сурагату — і ледзь не лічыць сябе шчаслівымі?

Міхась ТЫЧЫНА.

г.Слуцк.

Унікальныя экспанаты

Старыя паравозы з'язджаюцца ў музей

У экспазіцыі Музея чыгуначнага транспарту, які ствараецца недалёка ад брэсцкага лакаматыўнага дэпо, займуць месца 24 паравозы, 6 цеплавозаў, больш як дзесяць вагонаў і іншая тэхніка, якая даўно сышла з "дыстанцыі". Супрацоўнік лакаматыўнай службы Беларускай чыгункі Міхаіл Быль расказаў карэспандэнту, што асноўную работу па зборы ўнікальных экспанатаў правялі былы машыніст паравоза Аркадзь Прывіцень і работнік дэпо Юрый Заяц. Сярод паравозаў, якія знаходзіліся ў тупіках і на запасных пуцях, ёсць два, што сабраны яшчэ ў 1929 годзе, сем паравозаў германскай вытворчасці. Ёсць у калекцыі і славуты паравоз П-36 "Перамога", які можа развіваць скорасць да 120 кіламетраў у гадзіну. Менавіта гэтай машынай завяршылася гісторыя айчыннага паравозабудавання. Энтузіясты адшукалі два паравыя краны, пасажырскія і грузавыя вагоны ранніх выпускаў і нават драўляную чыгуначную платформу. Цеплавозны парк музея прадстаўлены шэрагам тэхнікі, якая даўно стала рэдкасцю на нашых пуцях. На жаль, адсутнасць сродкаў затрымлівае адкрыццё музея на няпэўны час.

Дарэчы, аналагічная экспазіцыя цяпер фарміруецца ў кітайскім горадзе Шэньян, дзе захавалася 19 паравозаў, выпушчаных у СССР, ЗША, Японіі і Германіі. На стварэнне музея кітайскі ўрад выдзеліў 14 мільёнаў юаняў. Акрамя таго, плануецца прыцягнуць да гэтай справы замежных інвестараў.

Андрэй ВАРАТНІКОЎ.

Вторник, 30 марта

БТ

06.30 Доброе утро, Беларусь!
07.00 Новости.
07.10 Доброе утро, Беларусь!
08.15 Политические диалоги.
08.40 Потребительская корзина. Социально-экономическая программа.
09.00 Новости.
09.15 "Все дело в шляпе". Развлекательно-познавательная игра-викторина.
09.40 Семейный телеканал "На волне взаимопонимания".
10.20 Станция "Академия наук".
10.35 "Сегодня с вами..." Президент ООО "Предприятие "Марко" Николай Мартынов.
11.00 Новости.
11.15 Телесериал "Ветер в спину" (Канада).
12.05 Третий тайм.
12.35 "А музыка звучит..." Произведения джазовой классики и авторские композиции в исполнении оркестра под управлением А.Кролла.
13.00 Новости.
13.15 "Соло для гитар". Творческие портреты В.Ткаченко, А.Иванова, Э.Измаилова.
14.05 Туробъектив. Путешествия, встречи, отдых.
14.25 Бездельник.
15.00 Новости.
15.15 Сериал для детей "Чародей" (Австралия — Польша).
15.45 Видеокурс английского языка. Передача 49-я.
16.10 Мультфильмы.
16.35 Телеочерк о грузинских переселенцах "Здесь земля такая". Передача из Гродно.
17.00 Новости (с сурдопереводом).
17.10 Уроки Н.Новожиловой.
17.35 Гости в дом. Ко Дню смеха.
18.00 Телесериал "Ветер в спину" (Канада).
18.50 Белорусский хит-парад.
19.00 Новости.
19.15 "Алло, "Событие". Прямая линия.
19.55 Международные спортивные новости.
20.15 Добрый вечер, Беларусь! В программе: "Разговор в прямом эфире", "Музыкальная тема", "Что делать?", юмористическая рубрика "Банка комиксов".
20.40 Колыбельная.
21.00 Панорама.
21.40 Событие.
22.00 Экран белорусского кино. П.Кормунин, Т.Карпова в кинокомедии "Теща".
23.10 Криминальная хроника.
23.15 Элисо Вирсаладзе и Наталья Гутман на Международном музыкальном фестивале "Минская весна-99". Сонатный вечер памяти Юрия Цирюка.
00.10 Новости.

ОРТ

08.00, 11.00, 14.00, 17.00 Новости.
08.15 Сериал "Жестокий ангел".
09.20 Взгляд.
10.05 Мультфильм "Папа, мама и золотая рыбка".
10.15 "Смехопанорама".
10.50 Домашняя библиотека.
11.15 "Вместе".
14.15 Сериал "Космическая полиция".
14.45 Счастливый случай.
15.30 ...До шестнадцати и старше.
16.00 Сериал "Жестокий ангел".
17.15 Угадай мелодию.
17.45 Здесь и сейчас.
18.05 Тема.
18.45 Сериал "Улицы разбитых фонарей-III".
19.45 "Спокойной ночи, малыши!"
20.00 Время.
20.50 Комедия "Одиноким предоставляется общежитие".
22.25 Однако.
22.40 "Мама" в "Тихом доме" Сергея Шолохова.

РТР

06.00 Доброе утро, Россия!
06.20 У всех на устах.
08.15 Дежурная часть.
08.35 TV-club.
08.50 Товары — почтой.
09.00 Сериал "Санта-Барбара".

09.45 Музыка, музыка...
10.00, 16.00, 19.00, 23.35 Вести.
15.15 Мультфильм "Боцман и попугай".
15.25 Сериал "Первые поцелуи".
15.50 Гомеопатия и здоровье.
16.30 "Башня".
17.00 Х/ф "Адъютант его превосходительства". 2-я с.
18.25 Сериал "Мистер Бин — черная змеюка".
19.40 Подробности.
19.55 "Аншлаг".
20.30 Комедия "Няньки".
22.15 Урмас Отт с П.Н.Гусевым — главным редактором "МК".
23.20 Дежурная часть.
00.05 Магазин на диване.

КУЛЬТУРА

07.05, 11.30, 13.30, 19.30, 23.05 Новости культуры.
07.25 Д/ф "И представление продолжается".
08.20 Международное обозрение.
09.00 Х/ф "Кукла". 7-я с.
10.20 "Театр моей памяти".
10.50 Книжный кладезь.
11.00 Мир авиации.
11.40 После новостей...
12.00 "Российский курьер".
12.40 Надежды Европы, или Любовь к трем апельсинам.
13.05 Академия спорта.
13.45 "Без визы".
13.55 "Рассказы старого сплетника".
14.20 Живое дерево ремесел.
14.25 "Сладкая избушка".
15.00, 17.30 Новости.
15.05 "Лукоморье".
15.25 Сериал "Четыре танкиста и собака".
16.05 "Поэзия и правда жизни".
16.35 Симфоническая поэма "Дон Жуан".
16.45 "Осенние портреты".
17.10 Ортодокс.
17.40 Ноу-хау.
17.55 Режиссер Г.Залкинд.
18.35 "Кумиры".
19.00 Мультфильм.
19.15 Чудо-сказка.
19.50 Д/ф "Неруш", "Фауст" Арлена", "Органы Белоруссии".
20.45 После новостей...
21.05 Тут шумят чужие города.
21.15 Х/ф "Кукла". 7-я с.
22.35 "Из концертного зала".

НТВ

06.00 Сегодня утром.
08.10 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
09.00, 11.00, 13.00, 15.00, 18.00, 21.00 Сегодня.
09.15 Герой дня без галстука.
09.40 Криминал.
10.05 Своя игра.
10.30 Дог-шоу "Я и моя собака".
11.30 "Старый телевизор".
13.30 Сериал "Детектив Нэш Бриджес".
14.20 "Сегоднячко".
15.30 Сериал "Человек из Суэца".
16.30 Впрок.
16.55 Сериал "Любовь и тайны Сансет Бич".
17.40 Криминал.
18.40 Герой дня.
19.00 Боевик "Фанат-II".
20.40 Куклы.
21.45 Сериал "Детектив Нэш Бриджес".
22.40 Сегоднячко.
23.20 Сегодня в полночь.

TV-6

05.55, 12.10 День за днем.
07.45, 17.25, 22.00 Дорожный патруль.
08.00, 10.00, 12.00, 14.00, 17.00 ТСН-6.
08.10, 22.25 Те Кто.
08.25 Юмористическая программа "БИС".
08.55, 14.30 Телемагазин для минчан.
09.00, 18.00 Сериал "Войны наркомафии".
10.10 Х/ф "Ночь над городом".
14.10, 23.40 "Знак качества".
14.20 "Мир чудес Анжелики Эффи".
14.45 Сериал "Дикая Роза".
15.35 Сериал "Дом собаки".
16.05, 22.40 ДИСК-канал.
16.35 "Избирком".
17.35, 00.05 Сериал "Третья планета от Солнца".
19.00 "Новости дня".
19.30 Сериал "Мистер Бин".
20.35 "В мире людей".
21.05 "Театр Рэя Бредбери".
22.15 Шесть новостей дня.
23.15 Сериал "Дневники Красной туфельки".
23.50 Видеоклипы.

8-й канал

18.00 Программа Кеннета Коупленда.
18.30 Х/ф "Удивительные приключения необыкновенного папы".
20.00 Свободный бой (тай-бокс).
20.30 Вечарніца.
20.45 Сериал "Хейди" (США — Австралия — Швеция, 1993 г.).
21.45 Между прочим... Построй свой дом.
22.00 Жан Клод Ван Дамм в х/ф "Колония". Они слишком опасны, чтобы жить, но слишком ценны, чтобы умереть.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: (017) 229-28-71.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 229-29-04.
E-mail : nv@irex.minsk.by

Індэкс 63222.

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №246. Нумар газеты надрукаваны з дыяпазітываў у ПП "Мэджык". Адрас: г. Мінск, вул. В. Харужай, 13. Падпісаны ў друк у 21.00. Фармат А-2. Тыраж: суботні — 61050 экз., у другія дні — 55000 экз. Заказ №446